Цана 15 гр.

Przesyłka opłacona ryczałtem

БЕЛАРУСКІ ФРОНТ

НЕЗАЛЕЖНЫ НАРОДНА-РАДЫКАЛЬНЫ ЧАСАПІС

РЭДАКЦЫЯ і АДМІНІСТРАЦЫЯ:
Вільня, Вастрабрамская 2—11
(Wilno, Ostrobramska 2—11).
Адчынена ад 9 да 19 г.

Часапіс выходзіць раз у месяц

Выпіска: на год 2 зал.
на паўг. 1 зал.
на 3 м-цы 50 гр.

№ 8 | Вільня, 5-га сьнежня 1936 г. | Год I.

Германафільства і іншыя ар'ентацыі беларусаў.

Разглядалі мы ў нашай газэце ўсходнюю ар'ентацыю беларусаў (на Расею), дзьве заходнія (на Польшч і на Літву), а цяпер разгледзім яшчэ дзьве заходнія ар'ентацыі: на Германію і на Латвію. А ў канцы, каб даць поўны абраз беларускіх палітычных ар'ентацыяў, скажам пару слоў і аб украінафільстве.

Германафільства пасярод беларусаў пачынаецца ад Вялікай вайны, а лепш кажучы, ад прыходу немцаў у наш край (1915 г.). У гэтым годзе немцы займаюць Вільню і твораць фронт на лініі Дзьвінск—Нарач—Смаргоні—Баранавічы і далей за Прыпяць, займаючы даволі вялікую часьць бел. зямель. Беларусы, якія асталіся ў Вільні, сілай новага свайго палажэньня прымушаны былі, без свайго нутранога пракананьня, ўвайсьці ў зносіны з нямецкай уладай. Нямецкая тагачасная палітыка ішла да таго, каб аслабіць расейскія і польскія ўплывы на занятых беларускіх і літоўскіх землях. Дзеля гэтага немцы пачалі адразу прыхільна адносіцца да літоўскага руху, а што датыча беларускага, дык спачатку ня ведалі, што з ім рабіць. Яны баяліся, ці ня крыецца ў ім якаясь расейская інтрыга. Аднак потым, зар'ентаваўшыся ў сытуацыі, яны пачынаюць спагадаць і беларускаму руху. У Вільні пачынае выходзіць двойчы ў тыдзень газэта „Гоман" (лацінкай і гражданкай), выдаюцца беларускія кніжкі, асабліва школьныя. Немцы закладаюць цэлы рад бел. пачатковых школ, ладзяць курсы для бел. вучыцялёў, а потым закладаюць бел. вучыцельскую сэмінарыю ў Сьвіслачы (Ваўкавыскага пав.). Апроч гэтага яны праводзяць навуковыя досьледы над беларускім мастацтвам і пішуць аб ім вельмі вартасныя кнігі.

Спагадаючы беларускаму руху, немцы аднак ня ставяць беларускай праблемы ў цэлай шырыні, так як яны ставілі літоўскую праблему. Чаму яны гэтак рабілі — згадаць трудна; сапраўдныя прычыны такой тактыкі крыюцца ў архівах нямецкага Генэральнага Штабу. Магчыма, што некаторая прычына ляжала і ў слабасьці тагачаснага беларускага руху, з якім немцы маглі і ня лічыцца, але гэта яшчэ ня ўсё. З успамінаў ген. Людэндорфа аб сусьветнай вайне мы даведваемся, што нямецкі Ген. штаб меў праект паставіць беларускую праблему ва ўсей шырыні, але на гэта не згадзіліся вышэйшыя і рашаючыя дзейнікі нямецкай палітыкі, якія спадзяваліся на аддзельны мір з Расеяй і не хацелі яе дражніць беларускай справай...

Адносіны немцаў да беларускай праблемы не зьмяніліся і тады, калі яны (ў лютым 1918 году) занялі Менск і большую часьць Беларусі аж па Оршу, Магілёў, Гомель. У тым часе ў Менску быў ужо стварыўшыся моцны беларускі цэнтр, які сакнуўся з нямецкай акупацыяй. Тады пасярод беларускіх дзеячоў паўстае ар'ентацыя на Нямеччыну ў шырэйшым гэтага слова значэньні і на ідэолёгічных асновах. Тым дзеячом здавалася, што ў інтарэсе Нямеччыны ёсьць стварыць сільную Беларусь, аддзяляючы яе ад Расеі. Сваё германафільства яны апраўдывалі тым, што Нямеччына знаходзіцца далёка ад Беларусі і дзеля гэтага не такая страшная, як напр. Расея або якая іншая дзяржава. Казалі, што Ням. не пагражае Беларусі дэнацыяналізацыяй, а ў саюзе з Ням. Беларусь можа разьвіцца і эканамічна, бо магчыме высылаць у Нямеччыну свае земляробскія прадукты, дастаючы адтуль фабрычныя вырабы. Апроч гэтага гаварылі, што Беларусь патрабуе помачы сільнай Нямеччыны, каб умацавацца і абараніцца ад сваіх бліжэйшых суседзяў... А праціўнікі ням. ар'ентацыі цьвярдзілі наадварот, што немцы з натуры сваей вельмі захопніцкія, што яны скалянізуюць Беларусь і будуць яе эксплёатаваць усімі магчымымі спосабамі, што ўрэшце Беларусь ператвораць у сваю калёнію... Аднак прыхільнікі ням. ар'ентацыі адказвалі, што трэба лічыцца з фактам акупацыі большай часьці Беларусі; што Ням. яўна імкнецца да падзелу Расеі і гатова заняць усю Беларусь, так як заняла ўсю Украіну і толькі патрэбны з боку беларусаў нейкі акт, які даў-бы немцам гваранцыю, што беларусы гатовы з імі супрацоўнічаць... На гэткім грунце ўзрасла думка паслаць ведамую тэлеграму да Вільгельма. У гэнай тэлеграме Рада Бел. Народнай Рэспублікі, падчыркнуўшы незалежнасьць і непадзельнасьць Беларусі, заявіла, што ў саюзе з Нямеччынай і пад яе абаронай бачыць добрую долю свайго краю ў будучыне...

Не атрымаўшы адказу на тэлеграму, беларускія дзеячы астылі ў сваім германафільстве. Прычыны, чаму Рада не атрымала адказу, цяпер выясьнены: Нямеччына, чуючыся штораз слабейшай на заходнім фронце, не хацела ствараць новых труднасьцяў на ўсходнім і прызнаньнем Беларусі не хацела дражніць бальшавікоў...

У апошніх часох, у сувязі з усходнімі нямецкімі плянамі, пачала расьці надзея, што Нямеччына ў магчымай вайне з бальшавікамі, паставіць беларускую справу на парадак дня. Мы аднак на гэту справу глядзім інакш. На наш пагляд нямецкія імкненьні ідуць цяпер у двух кірунках: паўночным (Прыбалтыка) і паўднёвым (Украіна). На Беларусь яны мала звярочваюць увагі. Урэшце Нямеччына ў рэалізацыі сваіх усходніх плянаў мае вялікіх праціўнікаў: прадусім Польшч, для якой нямецка-савецкая вайна гразіла-б утратай незалежнасьці і якая ніколі ня згодзіцца на пераход нямецкай арміі праз сваю тэрыторыю; потым Літва, Латвія, Эстонія, а галоўнае — Саветы і Францыя. На наш пагляд, ў цяперашніх суадносінах сіл у Эўропе рэалізацыя ўсходніх нямецкіх плянаў бадай што немагчыма. Дзеля усіх гэтых прычын ўважаем нерэальным і беларускае германафільства. Яно, як і кожная ар'ентацыя на чужую сілу, забівае ў народзе творчую энэргію, прывучае лічыць не на свае сілы, а на чужыя, застаўляе чакаць на нейкага „дзядзьку", які прыйдзе і зробіць ўсё за нас... Пры кожнай нагодзе трэба помніць, што сіла заўсёды лічыцца з сілай; тады толькі з намі будзе лічыцца як Усход так і Захад, калі мы будзем прадстаўляць сьведамую сваіх мэтаў сілу. А гэтая сіла ляжыць у *сьведамасьці* і *волі* народу.

Латвафільства. Ар'ентацыя на Латвію была нядаўна ў нашым народзе вялікая. Трэба прызнаць, што латышы, здабыўшы незалежнасьць і помнячы аб сваей даўнейшай няволі, адносіліся на пачатку да сваіх нац. меншасьцяў, а ў тым ліку і да беларусаў, даволі прыхільна. У Латвіі ў 1921-26 гадох буйна разьвіваецца ніжэйшае і сярэдняе школьніцтва, школам даецца ўрадавая і самаўрадавая дапамога, пры міністэрстве Асьветы творыцца Беларускі Школьны Аддзел, выдаюцца кніжкі і часапісы, закладаюцца і дзеюць шматлікія арганізацыі — словам, беларусы пад Латвіяй мелі ўсе магчымасьці разьвіцьця сваей культуры і народных асаблівасьцяў. Некаторыя бел. дзеячы нават паказвалі на Латвію, як на Піэмонт беларускага адраджэньня! Але гэтакі стан трываў нядоўга. Ад 1925-6 г. пачынаецца ўціск беларусаў у Латвіі, а ў 1930 годзе спыняецца бадай усё беларускае публічнае культурна-народнае жыцьцё. І гэтак—быў скасаваны беларускі Аддзел пры міністэрстве Асьветы, закрыты паступова сярэднія і ніжэйшыя школы, спынена дзейнасьць бел. арганізацыяў і г. д. Цяпер бел. меншасьць у Латвіі цярпіць жорсткі ўціск з боку латышскіх нацыяналістаў. Там праводзіцца дэнацыяналізацыя беларускага насельніцтва ня менш вострымі спосабамі, як і ў іншых дзяржавах. Дзеля гэтага латвафільская ар'ентацыя ў сучаснасьці пасярод беларусаў ня існуе.

Украінафільства. Пераходзячы да ўкраінафільства, трэба сказаць, што спасярод усіх бел. ар'ентацыяў украінафільства мае найбольш спачуцьця. Не памылімся, калі скажам, што ўвесь беларускі народ сэрцам ар'ентуецца на ўкраінскі народ і шукае з ім дружбы. Праўда, былі некаторыя дысонансы у беларуска-ўкраінскіх адносінах, як напр. дэкрэт ўкраінскага ўраду аб далучэньні Гомельскага, Рэчыцкага, Мазырскага і Пінскага паветаў разам з чыгункаю Лунінец—Гомель да Украіны (1918 год), цяперашнія прэтэнсіі некаторых украінскіх этнографаў да ўсяго (г. зн. і паўночнага) Палесься, але гэтыя дысонансы не маглі папсаваць добрых адносін паміж беларусамі і ўкраінцамі. Прыгэтым трэба адзначыць, што да ўкраінцаў чуюць вялікую сымпатыю ня толькі беларускія дзеячы, але і шырокія народныя масы, якія гэтак падазрона адносяцца да ўсіх далейшых і бліжэйшых суседзяў. Гэтым добрым адносінам паміж беларусамі і ўкраінцамі памагае і тое, што зышоўшыся разам, яны могуць размаўляць/гаварыцца кожны ў сваей роднай мове і пры-гэтым разумеюць адны другіх добра... Гэта ўсё спрыяе наладжаньню добрых адносін паміж двама народамі.

* * *

Гэтакім парадкам разгледзелі мы ўсе існуючыя і магчымыя ар'ентацыі беларусаў. Прыглядаючыся ўважна да бел. паліт. жыцьця, трэба прызнаць, што пасярод бел. найсільнейшай ар'ентацыяй ёсьць расейская (г. зв. палітычны камунізм), а найслабейшаю— польская. Гэта мы сьцьвярджаем зусім аб'ектыўна, бяз ніякай прадузятай думкі, як цьвярозыя і знаючыя свой народ палітыкі. Чаму гэтак дзеецца, мы ўжо пісалі і яшчэ будзем пісаць, а цяпер паставім іншае пытаньне: ці палітычныя ар'ентацыі ў народзе тэорэтычна дапушчальны і практычна карысны?

Тэорэтычна бяручы палітычныя арентацыі ў кожным народзе дапушчальны, бо кожны народ — і слабы і сільны — шукае саюзьнікаў дзеля асягненьня сваіх мэтаў. Гэтак пастyпаюць усе народы і ўсе дзяржавы. *Практычна* бяручы тая ар'ентацыя будзе найлепшая, якая прыносіць найболей карысьці для народу. А дзеля таго, што кожны чалавек, або лепш кажучы кожная група людзей (партыя)

Багаслужэньне папольску у Праваслаунай царкве у Польшчы.

Сёлета Сынод праваслаўнай аўтакефальнай царквы ў Польшчы апрабаваў пераклад праваслаўных багаслужэбных кнігаў з царкоўна-славянскага на польскі язык, а ўсьлед за гэтым, як падаюць газэты, ў некаторых праваслаўных царквах ужо пачалося багаслужэньне папольску. Пагражала-б гэта магчымасьцю шырокага ўвядзеньня польскае мовы ў праваслаўных царквах сьпярша ў вялікіх местах, а потым масава на тэрыторыі заселенай беларусамі і украінцамі.

Чым абʼясьняецца гэты дзіўны факт, што вышэйшыя праваслаўныя духоўныя ўлады з гэткай лёгкасьцю згадзіліся замяніць панаваўшы ў праваслаўнай царкве ад больш як тысячы гадоў царк.-славянскі язык языком польскім, тым больш, што ня чутно неяк было, каб праваслаўнае насельніцтва Польшчы гэтага жадала?

Паважных афіцыяльных матываў гэтага надта рызыкоўнага шагу, наколькі нам ведама, духоўныя ўлады не падалі і аб іх можна толькі дадумвацца. Справа гэта, аднак, знайшла ўжо водгукі ў прэсе і некаторыя высновы можна ўжо зрабіць.

Ведамы на віленскім грунце з сваіх асымілятарскіх імкненьняў адносна беларусаў польскі журналіст Мацкевіч (Cat), у газ. „Слово", сьпыняючыся над гэтай справай, наўперад сьцьвярджае, што сучасная праваслаўная царква, сьвяшчэнікі і ў першую чаргу архірэі, каторыя ўцяклі ад бальшавікоў, зьяўляюцца ўльтра-лёяльнымі ў адносінах да польскай ўлады. Ім нічога больш не астаецца, як трымацца палітыкі польскага ўраду, польскіх установаў, што яны і робяць. Дзеля таго Cat, выказваючыся ў прынцыпе супроць замены царк. слав. языка польскім і прымаючы пад увагу ўспомнены стан праваслаўнае царквы, сьцьвярджае, што галоўная адказнасьць за гэтую „рэформу" ляжыць на плячах польскай бюракратычнай рэлігійнай палітыкі, каторая імкнецца гэткім спосабам прышчапіць польскі патрыётызм праваслаўнаму насельніцтву.

Фактам ведамым ёсьць, што праваслаўная царква ў Польшчы пераживае глыбокі крызыс і сьмела можна сказаць, што яна трымаецца сяньня больш сваей традыцыяй, чымся апекай ейных пастыраў. Вышэйшыя прав. духоўныя ўлады і за нямногімі выняткамі ніжэйшыя ў нас адарваліся ад беларускай праваслаўнай масы і зьяўляюцца для яе чужымі нацыянальна і рабілі ўсё, каб гэту прорву паміж сабою і народам не засыпаць, а пашырыць. Найспраўядлівейшыя дамаганьні прав. беларускага насельніцтва, каторыя мелі на ўвеце ўзмацненьне царквы і паглыбленьне веры, ігнаруюцца дагэтуль. У рэзультаце пачалі шырыцца розныя сэкты і бязвер'е. Апошняе да таго-ж мела і мае моцнага саюзьніка ў бальшавіцкай антырэлігійнай прапагандзе, якая з асаблівай энэргіяй сеецца і не знаходзіць у праваслаўным жыхарстве ніякага процьдзеяньня. На гэткім сумным фоне думка Cat'а, што польская рэл. палітыка магла-б спрабаваць прышчапіць праваслаўным беларусам з помаччу царквы польскі патрыятызм (мы разумеем пад гэтым палянізацыю правасл. беларусаў)— запраўды мела-б некаторыя асновы. Але гэта толькі на першы пагляд і пад варункам ігнараваньня сапраўднага палажэньня рэчаў. Сяньня можна сьмела сказаць, што праваслаўных беларусаў у сваей масе нішто і ніколі ўжо ня можа здэнацыяналізаваць. У гэтым можна быць пэўным. І якраз гэтага мамэнту беларусы найменш баяцца. Акцыя ўвядзеньня польскага языка ў багаслужэньне, з гледзішча правасл. беларусаў хавае ў сабе іншую небясьпеку — яна пагражае існаваньню і чысьціні праваслаўнае веры наагул.

Увядзеньне польскага языка ў царкоўнае багаслужэньне падарве аўторытэт праваслаўнае царквы аканчальна. Калі-б ужо нічога супроць гэтага ня ўдалося зрабіць, праваслаўныя беларусы перастануць хадзіць у царкву. Адчыніцца значна шырэйшае поле для бязбожніцтва і сэктанцтва. Гэта агульная заўвага. Але апрача таго праваслаўныя беларусы ня могуць пагадзіцца з увядзеньнем польскага языка ў багаслужэньне яшчэ і з наступных прычынаў:

а) З гледзішча гістарычнага. Царкоўна-слав. язык ад тысячы гадоў ужываецца ў царкве на Беларусі. Язык гэты ня ёсьць якойсь „уласнасьцю скажам расейцаў, а калі ўжо аб гэта ідзе, дык беларусы і ўкраінцы маюць да яго значна больш правоў, чымся расейцы, бо-ж з Беларусі і Украіны ён шырыўся на Усход, аж аканчальна ўвайшоў у расейскую царкву. Амаль да канца панаваньня Кацярыны II у Расеі існаваў нават закон, што на вышэйшыя архірэйскія становішчы ня можна было вызначаць расейцаў, а толькі беларусаў або ўкраінцаў, бо яны толькі ведалі чысьціню веры і правільна тлумачылі царкоўна-слав. багаслужэбныя кнігі. Праваслаўныя беларусы і цяпер не дамагаюцца скасаваньня царк.-сл. языка і замены яго, нават беларускім. Прав. беларусы дамагаюцца затое пропаведзяў, бел. правасл. літэратуры, навучаньня дзяцей у школах пабеларуску, беларускіх сьвяшчэньнікаў, дзелаводзтва пабеларуску і г. д.

b) З гледзішча дагматычнага. Які-б ня быў добры пераклад, ён усё-ж ня можа аддаць дакладна арыгіналу. Тым-больш цяжка зрабіць пераклад з мовы нежывой, як царк.-слав., каторая мае свае асаблівыя звароты. Гэтыя недакладнасьці перакладу могуць зацямняць і зьмяняць асновы веры, ня кажучы ўжо аб тым, што пераложаныя словы папольску часам ёсьць недарэчнымі і сьмешнымі (напр. славянскае „многіе лета" пераложаны папольску — „długie lata, długie lata").

с) З гледзішча прынцыповага. На замену ад вякоў ужыванага царк.-славянскага языка на іншы, ды яшчэ не беларускі, без асноваў да гэтага, прав. беларусы згадзіцца ня могуць. Ды чаму гэта мае быць язык польскі? Ці толькі таму, што часьць прав. беларусаў жыве ў Польшчы? Але тады, лёгічна, трэба было-б, каб, скажам, у Літве прав. беларусы маліліся палітоўску, ў Латвіі—палатышску і г. д. Тасаваньне гэткага прынцыпу давяло-б да абсурду.

Пералічаных прычынаў аж надта хопіць, каб гэтую новую, запраўды нячуваную, акцыю вышэйшых духоўных уладаў праваслаўныя беларусы ацанілі належна.

М. Ш.

На беларускім грунце.

(Агляд беларускага жыцьця).

Надзвычайны сход Рады Бел. Інстытуту Г і К.

Як ужо нашы чытачы ведаюць, на 15.XI. г. г. быў склікаваны Надзв. сход Рады БІГ і К, каб вырашыць справу аддзельнага ці супольнага сьвяткаваньня юбілеяў БІГ і К і ТБШ. На парадку дня і стаяла гэтая справа. З лісты, якую падпісалі прысутныя сябры Рады, відаць было, што Рада сабралася ў поўным камплеце. У Раду Інстытуту, як ведама, уваходзяць сябры Цэнтр. Ураду ў ліку 7 мі чалавек, Рэвізыйная Камісія (3 чалавекі) і 4 старшыні Акружных Аддзелаў — усяго 14 чалавек. Апроч гэтага на салі было прысутных шмат сяброў Інстытуту, якія паводле Статуту маюць дарадчы голас.

Зараз па 12 гадз. старшыня Інстытуту кс. В. Гадлеўскі адчыніў Сход, сьцьвярджаючы прысутнасьць усіх сяброў Рады. Прыступлена да выбару старшыні сходу. Кандыдатаў было выстаўлена двух: кс. В. Гадлеўскі і кс. А. Станкевіч. Пры галасаваньні кс. В. Гадлеўскі атрымаў большасьць галасоў. Пасьля доўгай і гарачай дыскусіі быў зроблены перарыў, а пасьля перарыву старшыня Рэвізыйнай Камісіі Я. Пазьняк прачытаў такую дэкляарацыю:

„Рэвізыйная Камісія, разгледзеўшы пастановы Цэнтр. Ураду ў справе сьвяткаваньня Дня Бел. Культуры, прыйшла да перакананьня, што гэтыя пастановы статутовыя і дзеля гэтага ўважае, што яны на разглядзе Рады ня ёсьць актуальнымі. Адначасна сьцьвярджае, што справа супольнага ці асобнага сьвяткаваньня юбілеяў ТБШ і БІГ і К ня была высоўвана Рэвізыйнай Камісіяй на парадак дня Рады Інстытуту".

Выслухаўшы гэтую заяву, старшыня Рады, кс. В. Гадлеўскі, зачыніў Надзв. Сход Рады Інстытуту.

Зараз пасьля гэтага быў апрацаваны такі камунікат Бел. Інстытуту Г. і К:

„Гэтым падаецца да публічінакш разумее дабро свайго народу, бачым у кожным народзе арʼентацыйны падзел. І гэта зусім нармальна. Ненармальна тое, калі паўстаюць ў народзе групы, якія імкнуцца не да агульна-народнага дабра, а да свайго асабістага, партыйнага, здраджаючы гэтакім парадкам агульна-народныя ідэалы. Такія арʼентацыі трэба прызнаць шкоднымі для народу, бо яны збіваюць народ з правільнай дарогі, вядучай да асягненьня Найвышэйшых Ідэалаў.

У шаснаццатыя ўгодкі Слуцкага Паўстаньня.

У месяцах лістападзе і сьнежні сёлета прыпадаюць 16-тыя ўгодкі збройнага беларускага чыну—Слуцкага Паўстаньня супроць бальшавіцкае навалы ў 1920 годзе. Угодкі гэтых вялікіх падзеяў належна адсьвяткавала беларуская моладзь: студэнты УСБ і гімназісты Беларускае Гімназіі. З нагоды так важнага сьвята зьмяшчаем і мы тут хоць кароткі нарыс гэтай крывавай беларускай эпопэі, як адзін з мамэнтаў вызвольнае беларускае думкі.

Случчына пад канец 1920 году апынулася ў важных палітычных абставінах. У лістападзе гэтага году пакінулі польскія войскі на аснове польска-бальшавіцкага дагавору абшары Случчыны і адступілі за раку Лань. Такім чынам Слуцкі павет стаўся вольны — і гэтая вестка ўзварушыла ўсё насельніцтва Случчыны. Беларускі Нацыянальны Камітэт у Слуцку ўзнаўляе сваю дзейнасьць, засноўваюцца ў цэлым павеце валасныя нацыянальныя камітэты. Трэба тут адзначыць, што падгатаваўчая праца ў Случчыне пачалася ўжо ў 1918 годзе, калі быў заснованы Нацыянальны Камітэт у Слуцку ў часе нямецкае акупацыі. У склад гэтага Нацыянальнага Камітэту ўваходзіла тады 7 асоб з старшынёй Паўлам Жаўрыдам на чале. Незадоўга, бо пад канец 1918 году бальшавікі разганяюць Нацыянальны Камітэт, а старшыню Жаўрыда бяруць як закладніка. У 1919 годзе наступіла зьмена, Слуцк апынуўся ў руках польскага войска, Жаўрыд вярнуўся з палону дый ізноў становіцца на чале Нацыянальнага Слуцкага Камітэту. Да помачы ў арганізацыйнай працы быў пакліканы Пракулевіч на віцэ-старшыню.

Карыстаючы з прыпадковых абставін, у якіх апынулася Случчына, Нацыянальны Камітэт Жаўрыда падняў усіленую арганізацыйную і нацыянальную дзейнасьць. Дзеля сарганізаваньня самаабароны Случчыны ад наступу бальшавіцкае арміі, Нацыянальны Камітэт выбірае з свайго складу 3 асобы, якім і даручае арганізаваньне народнае міліцыі. Гэткім чынам творыцца г. зв. „палітычная тройка" ў асобах 1) Паўлюкевіча, 2) пар. Мацэлі і 3) Бачка, ў руках якой апынулася поўная ініцыятыва паўстаньня і начальнае кіраўніцтва вайсковае сілы. Дастае яна ад польскае вайсковае Каманды дазвол на фармаваньне народнае міліцыі і 500 стрэльбаў з малой колькасьцю амуніцыі.

Дзеля большае актыўнасьці і большага даверу „палітычная тройка" склікае ў першых днях лістапада 1920 г. ў м. Слуцку многалюдны сход беларускага насельніцтва з мэтай дакамплетаваньня Камітэту. Паўлюкевіч, паланафіл, асягнуў тады сваю мэту: знайшоў давер у масах Слуцкага веча дый нават быў выбраны на старшыню новага Нацыянальнага Камітэту ў складзе 9 чалавек. Гэта ўжо пагражала беларускай справе і беларуская кроў магла паліцца не за беларускія інтарэсы.

Трэба было тады адабраць ініцыятыву ад Паўлюкевіча, а гэта змог толькі зрабіць агульны Зьезд Случчыны.

Група Пракулевіча, ў якую ўваходзіў інж. С. Бусел, рашыла гэта правесьці. З мэтаю скліканьня агульнага Зьезду быў дэлегаваны грам. Бусел да Нацыянальнага Камітэту Паўлюкевіча, як неафіцыяльны прадстаўнік, якому і ўдалося ўгаварыць Паўлюкевіча аб патрэбе скліканьня агульнага Зьезду Случчакоў.

Такім чынам склікаецца на 14 лістапада 1920 году агульны беларускі Зьезд Случчыны ў м. Слуцку. На зьезд прыехала 107 прадстаўнікоў ад м. Слуцка і 15 валасьцей яго павету. Зьявіліся такжа і іншыя прадстаўнікі на зьездзе: 10 ад польскае вайсковае Каманды, дэлегацыя ад Балаховіча і Павал Жаўрыд ад Найвышэйшае Рады Беларускае Народнае Рэспублікі з даручанай яму граматай, як камісар Ураду БНР на Слуцкі павет.

Так сабраны агульны Зьезд Случчыны выбірае на старшыню Русака і віцэ-старшыню Пракулевіча. Гэтым самым ініцыятыва паўстаньня пераходзіць ад паланафільскае групы Паўлюкевіча да беларускае і незалежніцкае групы Пракулевіча.

Зьезд, прызнаючы сябе найвышэйшай уладай на абшарах вольнае Случчыны, аднагалосна выказаў, што насельніцтва Случчыны ніякае чужацкае ўлады над сабою ня прызнае і будзе лічыць законным толькі той урад, які выбярэ і пастановіць сам Беларускі народ. Такім часовым урадам была выбрана на агульным Зьезьдзе г. зв. Рада Случчыны з 17 асоб з эсэрам Пракулевічам на чале.

З поўнай сьведамасьцю неза-

нага ведама, што Цэнтральны Урад Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры на пасяджэньнях дня 11-га і 14-га кастрычніка сёлета пастанавіў сьвяткаваць юбілей 30-тых угодкаў літаратурнай творчасьці Якуба Коласа, а так жа сьвята Дня Беларускай Культуры, і на тым-жа пасяджэньні пастанавіў зьвярнуцца да Таварыства Беларускай Школы з прапазыцыяй супольнага наладжаньня гэтых сьвяткаваньняў.

У справе сьвяткаваньня юбілею 10-тых угодкаў існаваньня Беларускага Інстытуту Г і К. дня 4-га кастрычніка 1936 Цэнтральны Урад пастанавіў наладзіць гэтае сьвяткаваньне самастойна".

(—) *Кс. В. Гадлеўскі*, старшыня Цэнтр. Ураду БІГ і К.
(—) *Мгр. Я. Шутовіч*, сакратар Цэнтр. Ураду БІГ і К.
Вільня, 15.XI. 1936 г.

Гэтак адбыўся Надзв. сход Рады Інстытуту. Дык дзіўным і незразумелым выдаецца становішча „Б. Крыніцы",якая інфармавала сваіх чытачоў, што сход Рады зьбіраўся, але... не адбыўся! Сход Рады выпаў не па думцы „Б. Крыніцы" і дзеля гэтага яна ня хоча прызнаваць нават яго існаваньня.

Справаздачу аб гэтым сходзе Рады падаем хоць і спозьнена, аднак вельмі характэрную для нашага грамадзкага жыцьця.

Рэвізіі ў бел. арганізацыях і ў паасобных дзеячоў.

На раніцы ў суботу 28.XI. г. г. адбыліся масавыя рэвізіі ў віленскіх беларускіх арганізацыях: Беларускім Інстытуце Гаспадаркі і Культуры, Беларускім Каталіцкім Выдавецтве, Т-ве Беларускай Школы, Бел. Нацыянальным Камітэце, Беларускім Народным Аб'еднаньні і Беларускім Студэнцкім Саюзе. Забралі на перагляд кнігі і карэспандэнцыю.

Апроч гэтага была праведзена рэвізія ў такіх асоб: кс. В. Гадлеўскага, кс. А. Станкевіча, інж. Клімовіча, Я. Пазьняка, С. Паўловіча, М. Пяцюкевіча, Я. Шутовіча, Ул. Казлоўскага, В. Тумаша, Склубоўскага, Манцэвіча і інш.

Прычыны рэвізіяў няведамы. Паводле сабраных намі вестак, не арыштавалі нікога.

„Бел. Крыніца", падаючы вестку аб гэтых рэвізіях, пры канцы зрабіла зацемку, што рэвізія не адбылася ў рэдакцыях „Род. Краю", „Бел. Фронту" і людзей, што гуртуюцца каля гэтых часапісаў. На гэта заяўляем, што адносна „Б. Фр." гэта ёсьць няпрыстойная ілжа, якою „Б. Кр." адзначаецца ў інфармаваньні сваіх чытачоў. Гэтым сьцьвярджаем, што падчас рэвізіі ў кс. Гадлеўскага былі забраны адрасы „Бел. Фр." і карэспандэнцыя. Дзівіць нас, што „Б. Кр." у такія сумныя часы тасуе інсынуацыю і ілжу дзеля якіхсь сваіх, няведамых мэтаў. Але дарэмна, беларускае грамадзянства гэтак у Вільні як і на правінцыі знае нашыя незалежніцкія імкненьні і „лінію" „Бел. Крыніцы".

Спыненьне дзейнасьці Бел. Інстытуту Гасп. і Культуры.

Пастановай Віл. Гарадзкога старасты з дн. 4. XII. г. г. спынена дзейнасьць БІГ і К. Паліцыя забрала кнігі, акты і дакуманты. У матывах спыненьня сказана, што дзейнасьць Інстытуту пагражала бясьпечнасьці, супакою і публічнаму парадку. Апроч гэтага закідаецца Бел. Інстытуту Г і К, што прымаў удзел разам з ТБШ у стварэньні г. зв. Школьнага Сэкратарыяту і ў школьнай акцыі, якая, паводле цьверджаньня старасства, была пад уплывам КПЗБ.

Цэнтр. Урад БІГ і К падае рэкурс Віл. Ваяводзкім уладам.

Спыненьне дзейнасьці Т-ва Бел. Школы.

Як падаюць газэты, Віленскі Гарадзкі староста дн. 3.XII. г. г. спыніў дзейнасьць Т. Б. Ш. Сваю пастанову староста матывуе тым, што ТБШ амаль ад самага пачатку свайго існаваньня была прыбудоўкай КПЗБ і вяла шкодную для Польшчы і дзяржаўных уладаў дзейнасьць. Складаецца рэкурс.

Голад у Дзісеншчыне.

Ужо цэлы рад гадоў дзеля неўраджаю Дзісеншчына і суседняя Браслаўшчына цярпіць голад. Сёлета гэты голад большы, чым у прошлыя гады. Сяляне мясцамі не засеялі нават жыта, бо ня мелі насеньня. Помачы аднак сёлета менш, чым у прошлыя гады. Урад зьвярнуў увагу болей на беспработных гораду і праводзіць для іх зімовую помач. Трэба, каб беларускія арганізацыі выступілі перад урадам з жаданьнем помачы для галадаючай Дзісеншчыны і часткі Браслаўшчыны. Найболей адпаведнай для гэтага арганізацыяй зьяўляецца Бел. Нац. Камітэт.

Месяц Беларускага Студэнта.

У месяцы сьнежні сёлета Беларускі Студэнцкі Саюз У. С. Б. ў Вільні сарганізаваў шырокую акцыю сярод Беларускага Грамадзянства з мэтай здабыцьця матэрыяльнае помачы бедным студэнтам. Заклікаем гэтым усё беларускае Грамадзянства прыйсьці з грашавой падмогай нашым студэнтам, якія знаходзяцца ў вельмі цяжкіх матэрыяльных абставінах. Ахвяры кіраваць на адрэс: Камітэт месяца Бел. Студэнта, Вільня, Завальная 1—1.

На міжнародным грунце.

(Агляд міжнароднай палітыкі за месяц лістапад).

Палітыка Польшчы.

У цяперашнім сусьветным закалоце і магчымай вайне паміж двума блёкамі дзяржаў, Польшч выбрала для сябе палітыку *нэўтральнасьці*. Кіраўнікі польскай палітыкі добра ведаюць, што вайна ня дасьць для Польшчы абсалютна ніякай карысьці ані з гледзішча тэрытарыяльнага, ані якога іншага. Наадварот, вайна паміж такімі аграмаднымі і сільнымі дзяржавамі, як Саветы і Нямеччына, можа прынесьці для яе шмат няшчасьця, аж да ўтраты незалежнасьці ўключна. Дзеля гэтага польская палітыка ідзе цяпер у двух кірунках, 1) не дапусьціць да стварэньня двух варожых блёкаў, паміж каторымі Польшч апынулася-б, як паміж молатам і кавадлам, 2) пашукаць для сябе саюзьнікаў у сваей нэўтральнай палітыцы. Што датыча першага кірунку, дык трэба прызнаць, што польская палітыка не дайшла да памыснага для сябе рэзультату: варожыя блёкі пашыраюцца і ўзмацоўваюцца. А што датыча другога, дык тут польская дыплямацыя можа пахваліцца некаторымі здабыткамі. Да гэтакіх здабыткаў належыць навязаньне цясьнейшых зносін з Англіяй і аднаўленьне саюзу з Румыніяй.

Каб навязаць палітычныя вузлы з Англіяй, езьдзіў у мінулым месяцы ў Лёндын мін. Бэк. Аб гэтай падарожы польская і заграмічная прэса пісала вельмі многа, але якія ёсьць сапраўдныя рэзультаты гэтай падарожы ніхто ня ведае. З афіцыяльнага камунікату, які быў выданы пры ад'езьдзе мін. Бэка з Лёндыну, відаць, што гутаркі ішлі аб Гданску, аб магчымасьцях жыдоўскай эміграцыі з Польшчы, а галоўнае—аб забясьпечаньні міру на Усходзе Эўропы. Гэтыя справы зьяўляюцца найболей балючымі для польскай палітыкі. Кожны ведае, што *справа Гданска* ад лета г. г. стала вельмі актуальнай і дагэтуль ня вырашанай. Гданскі сэнат (урад) рашуча выступіў проціў камісара Лігі Народаў Лестэра, байкатуючы яго і не прызнаючы ягоных загадаў. Гэтым Гданск хоча вызваліцца с-пад апекі Лігі Народаў, так як гэта робіць Нямеччына.., Спор паміж Лестэрам і Гданскам Ліга Народаў перадала на вырашэньне Польшчы, якая аднак „крута" вырашаць ня хоча і ня можа, бо зьвязана саюзам з Нямеччынай... Такім парадкам трэба было яго парушыць аж у Лёндыне. З якім рэзультатам—няма ведама. А тымчасам Гданск імкнецца да вызваленьня ня толькі с-пад апекі Лігі Народаў, але і Польшчы...

Што датыча *жыдоўскай эміграцыі* з Польшчы, дык гэтая справа мае для польскай палітыкі аграмаднае значэньне. Даволі ўспомніць ад нутраных закалотах, якія перажывае Польшч з прычыны выступленьняў проціў жыдоў студэнцкай моладзі! Але апроч гэтага польская палітыка імкнецца да разгружэньня гарадоў і мястэчак ад жыдоўскага элемэнту, каб даць месца польскаму, які, ня маючы працы, бунтуецца і шукае выхаду з цяжкога палажэньня... Вось-жа польскі ўрад паставіў на парадку дня жыдоўскую справу і шукае для жыдоў новых эміграцыйных магчымасьцяў супольна з Англіяй. Гаворыцца аб большай эміграцыі ў Палестыну (арабы ўжо „ўспакоіліся"), у Біробіджан (Саветы), на выспу Цыпр і г. д. але справа далей праектаў яшчэ не пайшла і жыды, ня маючы куды выяжджаць, астаюцца ў Польшчы...

З жыдоўскай справай Польшч злучыла жаданьне для сябе *калёніяў*. Жаданьне такое Польшч афіцыяльна паставіла ў верасьні перад Лігай Народаў, аднак не атрымала ніякага пазытыўнага адказу. Патрэбу калёніяў Польшч матывуе лішкам свайго насельніцтва, якога няма куды дзець, а так-жа нястачай сыравіны для свайго промыслу. З прычыны пастаноўкі справы калёніяў перад Лігай Народай, частка польскай прэсы пісала, што ня варта было перад Лігай і языка біць аб зубы, бо Ліга можа ў найлепшым прыпадку вынесьці спагадную для

У Літоўцаў.

Масавыя рэвізіі адбыліся такжа ў літоўскіх арганізацыях і ў дзеячоў. Пасьля рэвізіяў спынілі дзейнасьць Літ. Нацыянальнага Камітэту і забаранілі дзейнасьць Т-ва сьв. Казімера ва ўсей прыгранічнай паласе.

лежніцкае ідэі Агульны Зьезд Случчыны, а пасьля Рада Случчыны, выдалі цэлы рад пастановаў і адозваў, у якіх выразна прадстаўлены: ініцыятыва, мэта і дзеяньне Слуцкага паўстаньня. Аб гэтым гаворыць прынятая на Зьезьдзе рэзалюцыя, пратэсты да савецкае ўлады, а перадусім дэклярацыя Рады Случчыны.

Зацемім тут характэрныя пункты з пастаноў агульнага Зьезду. У рэзалюцыі чытаем: (Рэзал. I. Зьезду 14. XI. 1920. Бел. музэй, Вільня). „Першы Беларускі Зьезд Случчыны, скліканы ў ліку 107 асоб вітае Найвышэйшую Раду Беларускае Народнае Рэспублікі і заяўляе, што ўсе свае сілы аддасьць на адбудову Бацькаўшчыны; катэгорычна протэстуе проціў занядбаньня(?) нашае Бацькаўшчыны чужацкімі і самазванчымі савецкімі ўладамі".

„Хай жыве *вольная незалежная, дэмократычная, народная Беларуская Рэспубліка ў яе этнографічных межах*" (падчырк наш).

Незалежныя імкненьні волі Народу да сувэрэннае дзяржавы яшчэ больш скрысталізаваныя ў дэклярацыі Рады Случчыны:

„У момант самаазначэньня ўсіх народаў і барацьбы іх за сваю самастойнасьць і свабоду, Бел. Рада Случчыны, выпаўняючы волю сялянства, паслаўшага яе і даверыўшага ёй абарону незалежнасьці нашае Бацькаўшчыны Беларусі, заяўляе ўсяму сьвету аб дамаганьнях, намерах беларускага сялянства:

1) „Беларусь павінна быць вольнай, незалежнай Рэспублікай у яе этнаграфічных межах"... „Абвяшчаючы аб гэтым і зьяўляючыся выразіцелькай волі Народу, Слуцкая Рада дэкляруе цьвёрда стаяць за незалежнасьць роднае Беларусі і бараніць інтарэсы сялянства ад насільляў з боку чужаземных захопнікаў, ў выпадку патрэбнасьці нават сілаю аружжа, ня гледзячы на лічэбную перавагу ворага, думаючы, што наша справа — справа праўдзівая, а праўда заўсёды закрасуе" (Дэклярацыя Бел. Р. Сл. 21. XI. 1920. Б. музэй, Вільня).

Дзеля поўнае ілюстрацыі духа Слуцкага Паўстаньня і волі Случчакоў зьвернем яшчэ на некаторыя сказы пратэсту:

„Вялікі Народны Збор — Усебеларускі Зьезд 15 — 17 сьнежня 1917 году, дбаючы аб долі Беларусі, зацьвердзіў на яе землях рэспубліканскі лад і абвесьціў *Незалежную* і *Непадзельную Беларускую Народную Рэспубліку*. (Падчырк наш). Стоячы *на гэтым грунце*, Зьезд сялян Слуцкага павету ў ліку 107 асоб, прадстаўнікоў сялян, выбраў Беларускую Раду Случчыны, якой часова і даручыў усю грамадзянскую ўладу".

Дык ніякіх сумлеваў адносна самастойнасьці Слуцкага Паўстаньня быць ня павінна. Рада Случчыны, часовы начальны ўрад на тэрыторыі Слуцкага павету, як гэта бачым з пратэсту, кіраваўся ідэямі пастаўленымі воляю Народу ў дзень 25 сакавіка 1918 году.

Аднак бальшавікі, ня гледзячы на пратэст народу, бяз усякага папярэджаньня пачалі занімаць тэрыторыю Случчыны ў канцы лістапада 1920 году. Узварушанае насельніцва хапіла за аружжа, каб сілаю не дапусьціць ворага ў свае межы. У кожнай вёсцы, воласьці творыцца саматужная, мясцовым Нацыянальным Камітэтам кіраваная, самаабарона. Узбураныя апорам бальшавікі пачалі растрэльваць кожнага маладога селяніна, як беларускага партызана.

У адказ на гэткія падзеі Рада Случчыны пачала арганізаваную аружную барацьбу з напіраючай сілай бальшавіцкай навалы

Творыцца галоўная вайсковая каманда, арганізуецца беларуская армія. Ядром гэтае арміі была народная міліцыя з 500 стрэльбамі. Але час быў кароткі, каб сарганізаваць стойкую самаабарону м. Слуцка. Бальшавіцкая навала стаяла ўжо на яго ўзмежках.

Дзеля гэтага галоўная вайсковая беларуская Каманда, заснаваная Радаю Случчыны выдае загад да народнае міліцыі—пакінуць м. Слуцк і сабрацца ў мястэчку Семежаве.

Гэткім чынам бальшавікі занялі Слуцк і частку тэрыторыі Случчыны без мацнейшага апору з боку беларусаў. Тымчасам у Семежаве гуртуюцца паўстанцы з усіх бакоў Случчыны. Ёсьць іх болей 10 тысяч. Тут-жа фармуецца з народнае міліцыі першы беларускі Слуцкі полк пад камандай палк. Гаўрыловіча, каторы неадкладна прыступіў да аружнага змаганьня з бальшавікамі, ня гледзячы на недахоп аружжа і амуніцыі. Апрача 500 стрэльбаў прынятых ад народнае міліцыі ніхто больш нічога ня даў.

У міжчасе паўстае ў Семежаве і другі беларускі Грозаўскі полк з маладзі м. Грозава. Камандзерам гэтага палка назначала Рада Случчыны кап. Семенюка.

Слуцкі і Грозаўкі палкі злучаныя ўтварылі г. зв. I Слуцкую дывізію, каманда якой была даручана кап. Анцыповічу, а пасьля кап. Сокал-Кутылоўскаму. Так сарганізованая першая беларуская дывізія з духам, выяўленым у

Польшчы рэзалюцыю, але ня можа даць каленіяў, бо... іх ня мае, а маюць вялікія дзяржавы, якія іх ня ўступяць!

У справе забесьпячэньня міру на Усходзе Эўропы (ўсходняе Лёкарно) Англія прызнала, што слушныя інтарэсы Польшчы будуць узяты пад увагу, калі будзе заключацца заходняе Лёкарно... На гэту тэму прэса пісала, што такое прызнаньне ня мае практычнай вартасьці, бо нічога не сказана, якія гэта будуць слушныя інтарэсы Польшчы, а падругое — ня сказана, хто мае пастанаўляць аб слушнасьці ці няслушнасьці польскіх жаданьняў... Дзеля гэтага мы ўважаем, што паездка мін. Бэка ў Лёндын не прынясла практычных здабыткаў для польскай палітыкі. І на гэты раз Англія выказала сваю заўсёдную асьцярожнасьць у адносінах да ўсходніх спраў, якія яе беспасрэдна не датычаць.

Больш вартасным ёсьць прыезд у Польшч румынскага міністра загр. спраў Антонэску. Прыезд гэты паказаў, што паміж Румыніяй і Польшчай узноўлены саюз, які быў захістаўшыся пры даўнейшым савэтафільскім мін. Тітулеску (яго ў Жэнэве заўсёды бачылі пад ручку з Літвінавым). Здабываючы для сябе Румынію, Польшч будуе бар'ер, які мае разьдзяліць двух заклятых ворагаў: Саветы і Нямеччыну, каб яны не пачалі вайны і ня кінуліся праз Польшч на сябе. Быць у будучай вайне ўсходняй Бэльгіяй Польшч ня хоча. А каб ёю ня быць, стараецца мець сільную армію і сучаснае ваарўжэньне. Але на гэта патрэбны грошы, якіх у Польшчы няма. Паводле апошніх вестак, Польшч усё-ж такі пасьля доўгіх перагавораў атрымлівае ад Францыі 2 мільярды 600 мільёнаў франкаў (каля 650 мільёнаў злотых) на ўваружэньні і правядзеньне інвэстыцыйнага пляну. Часьць будзе дадзена грашмі, а часьць ваенным матэр'ялам. Відаць, Францыя атрымала гваранцыю, што гэтае ўваружэньне ня будзе скіравана проціў яе саюзьніц: Саветаў і Чэхаславачччыны, а такжа, што польская палітыка ня зьвязана цесна з палітыкай Нямеччыны...

Ідэолёгічныя блёкі.

Ужо ад пару гадоў у палітычным сьвеце творацца два блёкі дзяржаваў: з аднаго боку камуністычна-лібэральны, а з другога — фашыстоўска-нацыянальны. Да аднаго блёку належаць: Саветы, Францыя, Чэхаславачччына, а да другога: Нямеччына, Італія, Вэнгрыя, Аўстрыя і... Японія. Нэўтральнымі хочуць быць: Англія, Бэльгія, Польшч, Румынія і інш. У лістападзе аканчальна сфармаваўся антыкамуністычны *нямецка-японскі блёк*, які мае аграмаднае палітычнае значэньне. Афіцыяльнай падставай гэтага блёку ёсьць змаганьне з камунізмам у сусьветным маштабе, а неафіцыяльна (як ходзяць чуткі) — здушэньне Саветаў. Японскія ўрадавыя кругі зараз пасьля падпісаньня гэтага пакту, заявілі, што Японія ня мае на мэце выступаць процій Саветаў, што яна хоча паддзержываць з імі нават прыязныя адносіны. а пакт мае на мэце змаганьне выключна з камінтэрнам... Але гэтым заявам японскіх палітычных кругоў ніхто ня верыць, бо каб змагацца з японскімі ці нямецкімі камуністамі, ня трэба такога аграмаднага блёку, на гэта хваціла-б японскай і нямецкай паліцыі. Апроч гэтага ў адным з пунктаў японска-нямецкага пакту ёсьць заклік да ўсіх дзяржаў. каб далучаліся да гэтага пакту...Кажуць што гэты пакт ёсьць уступам да процій-савецкай вайны.

Як да гэтага дайшло?

Прычын японска - савецкага пакту трэба шукаць у палітычных імкненьнях Японіі і Нямеччыны, а так-жа ў камуністычнай агітацыі Саветаў. Як ведама, Японія хоча забраць Усходні Сібір, а Нямеччына шукае прастору для сябе ў эўрапэйскай частцы СССР... Такім чынам імкненьні абодвых дзяржаў зыходзяцца. Апроч гэтага прычына крыецца і ў дзейнасьці самых Саветаў. Усім ведама, якую гарачую камуністычную агітацыю яны цяпер праводзяць па ўсім сьвеце! З аднаго боку яны вядуць афіцыяльную палітыку пры помачы савецкага камісарыяту загр.спраў, а з другога — творачы ў кожнай дзяржаве свае камуністычныя арганізацыі, зьвязаныя ў сусьветную камуністычную арганізацыю —Камінтэрн. Пры помачы камінтэрну (або „людовых" франтаў) яны рабілі націск на нутраное жыцьцё кожнай дзяржавы. Вось-жа гэты націск надакучыў некаторым дзяржавам і яны пастанавілі заложыць *анты-камінтэрн*, з яўнай мэтай здушэньня Саветаў, як гнязда камунізму. Згэтуль і паўсталі два ідэолёгічныя блёкі,якія рыхтуюцца да рашучага бою.Войны ідэолёгічныя часта завуцца *рэлігійнымі войнамі*. Перад такімі войнамі стаіць цяпер сьвет і такімі войнамі страшыў Літвінаў у Жэнэве. Але мыляўся-б той, хто-б думаў, што людзі праліваюць кроў за чыстую ідэю, бяз ніякай матэр'яльнай падставы. Кожная ідэя на гэтым сьвеце ёсьць злучаная з матэр'яльным існаваньнем...

Цікава яшчэ і тое, што апублікаваньне нямецка - японскага пакту прыпала якраз на дзень адчыненьня ў Маскве зьезду Саветаў. Кажуць што і гэты факт мае сваё значэньне...

Зьезд Саветаў.

У Маскве дня 25. XI. адчыніўся зьезд Саветаў, на якім Сталін рэфэраваў праект новай савецкай канстытуцыі. Аб гэтай канстытуцыі мы ўжо пісалі ў 2 нумары нашай газэты і тут над ёю затрымлівацца ня будзем. Адзначым толькі, што на адным з паседжаньняў выступаў Галадзед, старшыня рады народных камісараў Беларусі, які заявіў, што ў БССР побач з дзейнасьцю трацкістаў, дывэрсантаў і шпіонаў існуе яшчэ небясьпека з боку беларускіх нацыяналістаў, каторыя імкнуцца да адарваньня БССР ад савецкага Саюзу, але да гэтага, як казаў прамоўца, беларускія масы не дапусьцяць...

На наш пагляд, не дапускаюць да стварэньня незалежнай Беларусі не беларускія масы, а камуністы, якія, нясучы на ўвесь сьвет высокія клічы роўнасьці і свабоды, душаць у сябе народы і адзінкі. Новая савецкая канстытуцыя, як бачым з прамовы Галадзеда, гэтай свабоды не забесьпячае.

Эўрапэйская вайна ў Гішпаніі.

Гішпанскія падзеі інтарасуюць увесь сьвет. Там з кожным днём завязваецца штораз мацнейшы міжнародны вузёл, якога распутаць будзе ня так лёгка. У Гішпанію плывуць і едуць з усіх бакоў ахвотнікі ваяваць за свае ідэі. Едуць камуністы з Расеі, прыхільнікі „людовага" фронту з Францыі, едуць выгнаныя і уцёкшыя сацыялісты з Нямеччыны і Італіі—словам з усіх народаў, каб ваяваць з „фашызмам". Ізноў-жа з усіх старон едуць і прыхільнікі фашызму, асабліва з Нямеччыны і Італіі, каб ваяваць з гішпанскім „людовым" фронтам. Аб сіле гэтых успамагальных аддзелаў сьведчыць факт, што аднаразова толькі з Францыі ў Барцэлёну (сталіцу Каталёніі) прыбыло аж 2000 камуністаў, якія пад гукі інтэрнацыяналу прайшлі па гораду і былі скіраваны на Мадрыцкі фронт. А другая вестка кажа, што ў адным з портаў Гішпаніі высадзілася каля 5.000 немцаў! Апроч гэтага шмат ёсьць расейскіх камуністаў, дык няма нічога дзіўнага, што падзеі ў Гішпаніі завуць эўрапэйскай вайною. Кожная старана хоча выпрабаваць на праціўніку навейшыя тэхнічныя спосабы: танкі, аэрапляны, аружжа... Процій танкаў выдумалі кідаць бутлі з бэнзынай, якая спальвае і танк і схаваных там людзей... А процій аэраплянӑў зэнітныя гарматы, якія лоўка зьбіваюць гэтыя жалезныя птушкі... Калі гэтак патрывае далей, дык з няшчаснай Гішпаніі астануцца толькі руіны.

Мадрыцкі ўрад пераехаў у прыморскі горад Валенцыю. Паўстанцы ў Мадрыцэ напаткалі вялікі адпор з боку ўрадавых войск і чужаземных ахвотнікаў і муселі адступіць. Цяпер кожная старана мабілізуе войска і сьцягвае помач з усіх краёў Эўропы. Паводле апошніх вестак нямецкія і францускія а такжа савецкія ахвотнікі едуць у Гішпанію цэлымі масамі, лік якіх даходзіць да дзесяткаў тысяч! З усяго відаць, што вайна скончыцца ня скора, а нават можа перакінуцца на іншыя краі.

Наступны нумар „БЕЛАРУСКАГА ФРОНТУ" выйдзе 5-га студня.

пастановах Рады Случчыны, пайшла 27 лістапада 1920 году ў крывавы бой за сваю Бацькаўшчыну.

Першы крывавы хрост Слуцкага палка гэтак апісывае камунікат Опэрацыйнага Штабу Войск БНР, зьмешчаны ў „Беларускім Слове" („Бел. Сл." 4. XII. 1920 г. № 53).

„Аддзелы 6 роты Слуцкага палка пад камандаваньнем ппр. К, у часе разведкі ў раёне вёсак Быстрыца, Верабейчы, Васільчыцы і Чарнагубава, спаткаліся з бальшавіцкай разведкай каля вёскі Васільчыцы. Ад дапрошаных палонных даведаліся аб распалажэньні бальшавікоў.

Нашы аддзелы выбілі бальшавікоў з вёскі Васілішкі. Бальшавіцкія страты—3 забітых, 3 раненых і 1 папаўся ў палон. У нас 1 цяжка ранены. Мы захапілі шмат стрэльбаў, набояў і іншага вайсковага матэр'ялу.

Адводы 5 роты Слуцкага палка пад камандаваньнем ппр. Клішэвіча, ў сутычцы з ворагам пры вёсцы Дашнова занялі вёску, забраўшы ў палон 5 чырвонаармейцаў; вёска Лютовічы ў нашых руках.

7 і 8 роты таго-ж палка занялі вёску Мацкевічы. Нашы аддзелы ў Капыльскім напрамку занялі м. Цімкавічы. У баі пад м. Капыль у нас цяжка ранены 1, чырвонаармейцаў 12".

Поруч з аружным змаганьнем Рада Случчыны выдала некалькі адозваў да чырвонаармейцаў і да свайго насельніцтва, заклікаючы першых да нацыянальнае рэвалюцыі і спыненьня вайны супроць Беларусі, якая, як і іншыя народы, хоча жыць сваім народным жыцьцём, другіх да стойкае абароны свае Бацькаўшчыны. Чырвонаармейцы, змучаныя сусьветнай вайной і рэвалюцыяй, на такі заклік ахвотна ішлі і пры першай сутычцы здаваліся ў палон. Але ў палоне нельга было дзяржаць большай колькасьці савецкіх ваякаў. Звычайна ваенны штаб па разаружаньні дапытваўся аб сытуацыі бальшавіцкіх войск і выпускаў палонных на свабоду, так што яны маглі або стаць пад беларускім нацыянальным сьцягам, або вярнуцца да свае радні ў саветы. Хутка аднак бальшавікі скіравалі супроць паўстанцаў камуністычныя атрады, якія так лёгка ўжо не здаваліся, а змагаліся самым заўзятым спосабам. У занятых вёсках камуністы праводзілі масавыя арышты і ня менш масавыя экзэкуцыі. Шчасьце паўстанцаў было зьменнае; па крывавых баёх пад м. Капыль, Семежавам, Вызнаю, Цімкавічамі і іншымі меншымі мястэчкамі і вёскамі, беларуская дывізія, ня маючы вонкавай помачы і патрэбнай колькасьці ваеннага матэр'ялу, а перадусім кулямётаў і гарматаў, не змагла, міма надчалавечага гэройства паўстанцаў, устрымаць бязупыннага напору добра ўваружанага камуністычнага натаўпу. З гэтай-жа прычыны беларуская Слуцкая Дывізія па цяжкіх стратах прымушана была часова адыйсьці да ракі Лань.

Яшчэ некалькі разоў паўстанцы прабавалі рабіць контратакі і часта даволі ўдачныя, але ўдачы былі толькі часовымі. Бальшавікі пасьля кожнае контрофэнзывы сьцягівалі йшчэ большыя сілы і яшчэ з большай энэргіяй накідаліся на паўстанцаў. У гэтай так цяжкай хвіліне для беларускае арміі ня было ніякае знікуль помачы. Толькі вайсковая беларуская камісія ў Лодзі выдала дня 19/XII.20 прыказ № 1 да афіцэраў і жаўнераў, наказываючы ім поўную вайсковую дысцыпліну і яшчэ большую ахвярнасьць у абароне загрожанае Бацькаўшчыны. Гэтага было замала. Дня 28 сьнежня 1920 г. Слуцкая Дывізія перайшла польскую граніцу. Тут яе разаружылі і інтэрнавалі, спачатку каля Сіняўкі, пасьля ў Беластоку. Так скончылася крывавая ды гэройская эпопэя Слуцкага Паўстаньня.

Трэ' яшчэ ўспамянуць, што ня ўсе паўстанцы аддалі аружжа ў рукі палякоў. Дробныя аддзелы пайшлі ў Слуцкія лясы, творачы партызанцкія групы. Праз цэлы год амаль, з нячуваным упорам трывожылі бальшавікоў, покуль да рэшты ня былі пакананы.

Слуцкае Паўстаньне не абняло цэлага беларускага народу і ня давяло да здзейсьненьня яго волі, выражанай у акце 25 сакавіка 1918 году, але паказала ўсяму сьвету, што Беларускі народ хоча здзейсьніць сваю волю і ў абароне сваіх ідэалаў гатоў аддаць жыцьцё на аўтар Бацькаўшчыны. Чэсьць героям Случчыны!

В. П.

Пры рэвізіі часьць нашых адрасоў забрала паліцыя, дзеля гэтага магчымы недакладнасьці ў рассылцы гэтага нумару „Б. Фронту". Аб неатрыманьні дайце нам знаць і мы пастараемся даслаць.

Рэдактар-Выдавец: В. ПАПУЦЭВІЧ. Друк. Я. Левіна Вільня, Нямецкая вул. 22. Тэл. 21-14.